# ГАЗЭТА «ORKA» ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ПОЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў 20-Я ГГ. ХХ СТ.

**В.М. Сідоранка**

Польскамоўныя перыядычныя выданні з'яўляюцца важнымі крыніцамі па гісторыі палякаў на Беларусі ў 20-х гг. ХХ ст. Для нацыянальных меншасцяў ў гэты час выдаваліся газэты і часопісы на роднай мове, гэта ўваходзіла ў праграму ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі РКП(б) і КП(б)Б. Для палякаў выходзіла наступная перыёдыка: «Trybuna Komunistyczna», «Trybuna Radziecka», «Młody Towarzysz», «Młot», «Głos Młodziezy» і «Orka». Яны арыентаваліся на розных чытычоў: рабочых, сялян, моладзь, савецкіх і партыйных кіраўнікоў, настаўнікаў і г.д.

«Orka» – ў перакладзе «Саха», з'ўлялася афіцыйным органам ЦК КП(б)Б і ўяўляла сабой сялянскі штотыднёвік. Газэта каштавала 5 капеяк. У ёй асвятляліся самыя розныя бакі жыцця польскага насельніцтва БССР і мерапрыемствы КП(б)Б ў дачыненні да палякаў. Яна імкнулася ўздзейнічаць на чытача не толькі словам, але і візуальна. Для гэтага ў «Orkę» змяшчалася шмат рысункаў, карыкатур і фотаздымкаў. «Orka» шмат супрацоўнічала з карэспандэнтамі з месцаў, кожны нумар змяшчаў шэраг артыкулаў аб стане жыцця палякаў розных вёсак, гарадоў, раёнаў. Такія артыкулы пісаліся на основе лістоў, што дасылалі карэспандэнты ў рэдакцыю. Пры вывучэнні гісторыі польскага насельніцтва БССР такія артыкулы могуць даць дадатковую інфармацыю даследчыку. Напрыклад, кааперацыя ў польскай вёсцы праходзіла не адназначна на карысць беднаты. У рэдакцыю газэты прыйшоў ліст з в. Рудня-Шлягіна Свяцілавіцкага раёна Гомельскай акругі. У ім гаварылася, што арганізаваны Камітэт Узаемадапамогі атрымаў 50 дзесяцін зямлі і насенне, а яго загадчык Б. Ключыньскі размеркаваў усё гэта сярод заможных. Такія лісты-скаргі не проста друкаваліся ў «Orkę», інфармацыя даводзілася да ведама мясцовай адміністрацыі, якая абавязана была тэрмінова адрэагаваць і прыняць меры.

Пісала «Orka» аб працы сярод жанчын, аб барацьбе з непісьменнасцю, аб просьбах насельніцтва адчыніць польскую школу, арганізаваць нацыянальны сельсавет, аб пашырэнні трох-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

польнага севазварота ў гаспадарках палякаў, аб зніжэнні цэн, аб выстаўках лепшых парод жывёлы, аб крэдытаванні сельскай гаспадаркі ў Беларусі і г.д. Усё гэта так званая інфармацыя з месцаў.

«Orka» паведамляла сваіх падпісчыкаў аб жыцці Савецкай краіны, аб яе знешняй палітыцы. Вось што пісала яна аб утварэнні СССР: «O tym na ile słuszna jest polityka naszych organów centralnych w dziedzinie budownictwa narodowościowego świadczy ten fakt, że w przeciągu 4ch lat istnienia Związku SSR żadna z republik nie wykorzystala swego prawa wyjścia ze Związku, przeciwnie do Związku przyłączyłosię jeszcze 2 republiki Azji środkowej – Turkmenistańska i Uzbekistańska.» ["Аб тым на колькі правільнай з'яўляецца палітыка нашых цэнтральных органаў у галіне нацыянальнага будаўніцтва сведчыць той факт, што на працягу 4-х год існавання Саюза ССР не адна з рэспублік не скарысталася правам выхаду з Саюза, наадварот, да Саюза далучыліся яшчэ дзве рэспублікі сярэдней Азіі – Туркменістан і Узбекістан."]

На першых аркушах «Orka» змяшчала звесткі аб тым, што адбываецца ў свеце, аб жыцці палякаў суседняй Польшчы. Такія артыкулы выключна тэндэнцыйныя. Спад рабочага руху ў Еўропе падаецца як наступленне контрэвалюцыі, здрада сацыял-дэмакратаў інтарэсам рабочых. Не абмінала ўвагай газэта справы Заходняй Беларусі, яе цяжкі стан апасля таго як яна апынулася ў складзе Польшчы. У рубрыцы «Сусветная хроніка» абавязкова друкавалася інфармацыя аб забастоўках, выступленнях рабочых, ходзе рэвалюцыі ў Кітаі і іншых палітычных падзеях ў свеце.

Акрамя інфармацыйнай часткі гэты сялянскі штотыднёвік друкаваў літаратурныя творы польскіх аўтараў і беларускіх пісьменнікаў ў перакладзе на польскую мову. Шосты аркуш газэты быў тэматычны, ішоў пад назвай «Poradnik gospodarczy» і змяшчаў розныя парады для селяніна-паляка як паляпшаць і ўдасканальваць сваю гаспадарку.

Стаўленне польскага насельніцтва да «Orki» было не аднаначным. Настаўніца з в. Рудня-Столбуньская Р.Шаблоўская пісала да сакратара Гомельскага польбюро АК КП(б)Б Мінейкі, што у нас ў вёсцы з большым жаданнем чытаюць газэты расейскія і беларускія, але не польскія, бо гавораць, што «Orka» oszukuje» ["ашукоўвае"].

Савецкая прэса ніколі не была люстэркам, што паказваэ рэальную рэчаіснасць, ды і мэты такой перад сабою яна ніколі не ставіла. Незалежных польскамоўных выданняў у БССР не было. Прэса была цалкам залежная ад мясцовых партыйна-савецкіх органаў і цэнзуры.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

"Orka" з'яўляецца рознапланавай крыніцай, у ёй змяшчаецца матэрыял рознага паходжання. Праца з кожным відам газэтнага жанра патрабуе асобнага падыхода. Матэрыял газэты можна разбіць на 2 групы:

1) Афіцыйныя дакументы ураду БССР, СССР, дакументы цэнтральных органаў ВКП(б) і КП(б)Б, у тым ліку указы, пастановы, законы і распараджэнні. Такая група дакументаў павінна быць цалкам прынята на веру, бо гэта афіцыйныя матэрыялы, якія выдаваліся дзеля ведама дзяржаўных устаноў і арганізацый. Да групы афіцыйных матэрыялаў можна аднесці паведамленні, што друкаваліся пад рубрыкай «Хроніка».

2) Газэтная інфармацыя. Па форме – гэта газэтная справаздача, рэпартаж, інтэрв'ю. Газэтная інфармацыя паходзіць з розных крыніц і таму кожны жанр патрабуе асобнага стаўлення і своеасаблівага, адпаведнага падыходу.

У сувязі з тым, што перыёдыка прадстаўляе сабою масавыя крыніцы, для яе аналіза можна выкарыстоўваць камп'ютарныя тэхналогіі, розныя статыстычныя праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ